Дети ответят за отцов

Стар. 4

Массовые увольнения

Стар. 5

За Свабоду

Стар. 8

№44
СТУДЗЕНЬ 2009

Выбар

Газэта Магілёўскай абласной кааліцыі дэмакратычных сілаў

# Магілёў адсвяткаваў гадавіну атрымання Магдэбурскага права



ПЁТАР МІГУРСКІ — ЧАЛАВЕК ГОДА

ПАДЧАС УРАЧЫСТАЙ ВЕЧАРЫНЫ, АРГАНІЗАВАНАЙ АКТЫВІСТАМІ РУХУ “ЗА СВАБОДУ” УШАНАВАНЫЯ ЛЕПШЫЯ ПРАДСТАЎНІКІ ГРАМАДЗЯНСКАЙ СУПОЛЬНАСЦІ.

Урачыстая вечарына з нагоды 432-х угодкаў надання Магілёву Магдэбурскага права арганізавана актывістамі Руху “За Свабоду” ды іншымі прадстаўнікамі дэмакратычнай супольнасці.

Падчас святкавання ўшанаваныя лепшыя грамадскія дзеячы Магілёўшчыны. У намінацыі “Чалавек года” за кіраванне Магілёўскай абласной кааліцыяй дэмакратычных сіл, прынцыповасць і мужнасць у час выбарчай кампаніі 2008 года адзначаны Пётр Мігурскі.

У намінацыі “Вынік года” адзначана Горацкая антыядзерная група. Яе каардынатар Пётр Маланачкін (на здымку) ушанаваны за актыўную працу па недапушчэнню будаўніцтва АЭС на Кукшынаўскай пляцоўцы.

”Выданнем года” прызнана газета “Вольны горад” (рэдактар Сяргей Няроўны) за барацьбу, прынцыповасць і адстойванне маральных каштоўнасцяў.

Званне “Змагар года” атрымаў Мікола Расюк за апантанае адстойванне правоў працоўных.

Усе намінанты атрымалі памятныя дыпломы з падзякамі, падпісаныя лідэрам Руху “За Свабоду” Аляксандрам Мілінкеівчам, кіраўніком выканкама абласной асамблеі дэмакратычных сілаў Рыгорам Кастусёвым і кіраўніком ініцыятывы “Грамадзкі магістрат Магілёва” Аляксандрам Сілковым.

У бліжэйшы час плануецца таксама ўганараваць дыпломамі людзей, датычных да аднаўлення Магілёўскай ратушы ў намінацыі “Падзея года”.

Працяг на стар. 2

№44 СТУДЗЕНЬ 2009 Выбар

# Магілёў адсвяткаваў гадавіну атрымання Магдэбурскага права

Працяг. Пачатак на стар. 1

" У гэты дзень закладаецца традыцыя шанавання лепшых грамадзкіх дзеячоў Магілёўшчыны, а таксама абвяшчаецца пра заснаванне новай грамадсзкай ініцыятывы "Магілёўскі грамадскі магістрат", мэта якога " вяртанне нашага гораду да традыцый самакіравання, " кажа ўдзельнік імпрэзы, сябра Рады Руху "За Свабоду" Віталь Васількоў.

## ДАВЕДКА

28 студзеня 1577г. Магілёў, які да таго часу вырастаў у адзін з важных гарадоў Вялікага Княства Літоўскага, атрымаў ад караля Рэчы Паспалітай права на гарадзкое самакіраванне. У выніку ўся ўлада ў горадзе перайшла да магістрату, у які ўваходзілі бурмістры, радцы, лаўнікі. Ачольваў магістрат войт, які да сярэдзіны XVII ст. прызначаўся каралём пажыццёва. Пасля магілёўцы дамагліся права самім выбіраць войта, а таксама ягонага намесніка (лентвойта), які кіраваў горадам у часе адсутнасці войта. Войт меў вялікія правы, яму падпарадкоўваліся ўсе месцічы. Магістрат абіраўся гараджанамі на двухгадовы тэрмін, прычым выбіраліся некалькі яго складаў, каб штогод улада пераходзіла да новага складу.

Пры магістраце існаваў і кантрольна-дарачы орган з 12 асобаў, якія таксама выбіраліся гараджанамі. Магістрат займаўся фінансавымі, гаспадарчымі, судовымі ды іншымі гарадзкімі справамі.

Наданне Магдэбургскага права Магілёву прывяло да таго, што гараджане самі вырашалі ўсе праблемы гарадзкога жыцця і пазбавіліся свавольства асобных феадалаў і дзяржаўных чыноўнікаў.

Магілёўцы называлі гэтае права "правам хрысціянскім, ад Бога дадзеным".



ЗМАГАР ГОДА:

МІКАЛАЙ РАСЮК, РАБОЧЫ "ЛАЎСАНБУДА"

- Як зараз складаецца сытуацыя на вашым прадрыемстве?

- Ідзе барацьба адміністрацыі за мае выцісканьне з прадпрыемства. Атрымаў паведамленьне, што перавожуся на пачасавую аплату працы. У аддзеле кадраў рыхтуюцца кантракты для рабочых.

- То можа й добра, бо кантракт есьць нейкай гарантыяй правоў працаўніка?

- Правы абараняе Закон. А гэта - яшчэ адзін спосаб прывязаць людзей да працы за мізэрны заробак. Сярод рабочых зараз ходзяць чуткі, што пасля заключэньня кантрактаў многіх прымусова адправяць на будаўніцтва АЭС. Зараз дабраахвотнікаў ехаць туды вельмі няшмат.

СЯРГЕЙ НЯРОЎНЫ, ГАЛОЎНЫ РАДАКТАР ГАЗЭТЫ "ВОЛЬНЫ ГОРАД" (КРЫЧАЎ)

- Што зараз адбываецца ў радакцыі?

- Рыхтуемся да працягу судовага працэсу супраць раеннай газэты "Ленінскі кліч", які цягнецца ўжо год.

- Гэты працэс ініцыяваны вамі?

- Так, мы падалі зыск на абарону гонару й годнасьці, паколькі "раенка" дазволіла сабе публікацыю матар'ялаў, якія мы лічым зняважальнымі ў адносінах да сябе.



ГЕНАДЗЬ СУДНІК — СЯРГЕЮ НЯРОЎНАМУ: ТАК ТРЫМАЦЬ!

- Калі адбудзецца паседжаньне?

- Сямнаццатага лютага ў Чавусах.

- Аб чым яны?

- Адна пра гісторыю грошай, другая – аб каталіцызме. Пра трэцяю пакуль не скажу, даведаецеся пазьней.

ПЕТАР МІГУРСКІ, НАВУКОВЕЦ.

- Чым плянуеце займацца ў надышоўшым годзе?

- Хачу больш шчыльна заняцца творчасьцю, бо у апошні я гады на яе не хапала часу. Зараз працую адразу над трыма кніжкамі.

*Цікавіўся Іван МАРОЗАЎ, фота Ганны ІЛ'ІНОЙ*

# “Кольны стол” у Магілёве

## СУСТРЭЧА ПРЫСВЕЧАНАЯ 432-Й ГАДАВІНЕ НАДАННЯ МАГДЭБУРСКАГА ПРАВА, АДБЫЛАСЯ Ў МАГІЛЁВЕ

Удзел у сустрэчы прынялі краязнаўцы з гарадоў і мястэчак Магілёўшчыны, якія мелі права на самакіраванне (магдэбурскае права) пад час знаходжання Беларусі ў складзе Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай.

Магдэбурскае права – феадальнае гарадское права, паводле якога эканамічная дзейнасць, маёмасныя правы, грамадска-палітычнае жыццё, саслоўны стан гараджан рэгуляваліся ўласнай сістэмай юрыдычных норм, што адпавядала ролі гарадоў як цэнтраў вытворчасці і грашова-таварнага абмену. Упершыню ўзнікла яно ў г. Магдэбург (Усходняя Германія). Першым з беларускіх гарадоў права на самакіраванне атрымала Вільня, якой магдэбурскае права было нададзена яшчэ 22 сакавіка 1387 года.

На Магілёўшчыне магдэбурскае права пачынае распаўсюджвацца з 28 студзеня 1577 года, калі права на самакіраванне атрымаў Магілёў і гэты працэс працягваецца тут на працягу ўсяго перыяду ўваходжання рэгіёну ў склад Рэчы Паспалітай. У 1633 годзе магдэбурскае права атрымаў Крычаў, у 1634 годзе Бялынічы, Мсціслаў і Чавусы, у 1641 годзе Чэрыкаў, у 1755 – Шклоў. Таксама існуюць ускосныя звесткі пра наданне магдэбурскага права Бабруйску ў 14 стагоддзі (заняпад горада ў 16 ст., магчыма, зняў яго актуальнасць для горада) і Быхаву.

Пад час сустрэчы ўдзельнікі распавялі аб сваіх даследваннях, якія скіраваны на вывучэнне гістарычнай мінуўшчыны роднага края, падзяліліся нанава адшуканымі ў архівах гістарычнымі матэрыяламі. У прыватнасці, краязнаўца з Шклова Аляксандр Грудзіна не пагадзіўся з прыведзенымі ў большыні гістарычных выданнях дадзенымі, што горад Шклоў атрымаў магдэбурскае права толькі ў 1755 годзе (па іншых дадзеных – у 1762 г.). Ён паведаміў прысутным, што, паводле даследванняў знакамітага беларускага гісторыка М. А. Ткачова, Шклоў атрымаў магдэбурскае права адначасова з Магілёвам у 1577 годзе. Барыс Вырвіч азнаёміў прысутных з апошнімі даследваннямі бялыніцкага краязнаўцы Міхася Карпечанкі, які знайшоў цікавыя матэрыялы аб змаганні бялынічан пасля далучэння да Расійскай імперыі за вяртанне магдэбурскага права. Яны нават распачалі судовы працэс. Справа гэта аказалася зусім няпростай – высвятленне ўсіх акалічнасцяў доўжылася на працягу 29 гадоў: з 1803 да 1832. Для пацвярджэння сваіх правоў бялынічане прадставілі ў Магілёўскі павятовы суд, а затым і ў Сенат арыгіналы двух прывілеяў гораду на магдэбурскае права – фундацыйны 1634 года і канфірмацыйны 1703. Але Сенат гэтыя дакументы назваў “несапраўднымі”, што надзвычай абурыла хадайнікаў. Каб адбіць ахвоту і надалей дамагацца сваіх законных правоў у адносінах да найбольш актыўных бялынічан былі прыняты самыя рашучыя меры: яны абвінавачаны, як “возмечтавшие о мнимой вольности”, былі залічаны ў прыгонныя, двух найбольш актыўных змагароў прылюдна высеклі бізунамі і выслалі на катаргу ў Сібір.

Каардынатар ПРГА “Рух за Свабоду” у г. Магілёве Віталь Васількоў падзяліўся ўспамінамі аб спробе адраджэння мясцовага самакіравання ў Магілёве ў 1990-1994 г., якую зрабіў дэмакратычна абраны Гарсавет.

Напрыканцы сустрэчы адзін з яе арганізатараў, сябар Рады Магілёўскай абласной кааліцыі дэмакратычных сіл Аляксандр Сілкоў, прапанаваў удзельнікам “круглага стала” стварыць грамадскую ініцыятыву “Грамадскі магістрат”, якая б займалася аднаўленнем і папулярызацыяй ідэі мясцовага самакіравання сярод насельніцтва Магілёўскай вобласці. Ідэя была падтрымана ўсімі ўдзельнікамі “круглага стала”.

***Іван Барысаў***

ВОСЬ ДЫК ТАК!

# Затрымалі за Магдэбурскае права

Сто пяцьдзясят тры асобнікі спэцыяльнага выпуску газэты “Магілёўскі час” канфіскавалі міліцыянты ў затрыманых грамадзкіх актывістаў Аляксандра Сілкова, Сяргея Нягаціна й Юрыя Стукалава. Спэцвыпуск быў прысьвечаны 432-й гадавіне наданьня Магілёву Магдэбурскага права.

Паводле актывіста Руху “За Свабоду” Аляксандра Сілкова, міліцыянты склалі пратакол канфіскацыі газэт і паведамілі, што на працягу дзесяці дзён іх вернуць, калі будзе выяўлена, што яны выдаваліся ў адпаведнасьці з заканадаўствам.

Аляксандар Сілкоў заяўляе, што будзе скардзіцца на незаконныя, на ягоную думку, дзеяньні міліцыі — затрыманьне й канфіскацыю газэт. Паводле яго, у газэце былі пазначаныя выходныя зьвесткі, і падставаў для яе канфіскацыі ў міліцыянтаў не было. Пры сабе актывісты мелі пашпарты.

Актывістаў затрымаў нарад міліцыі каля дванаццатай гадзіны дня на цэнтральнай вуліцы Магілёва — Ленінскай. Больш як гадзіну іх пратрымалі ў пастарунку Ленінскага аддзелу міліцыі.

№44 СТУДЗЕНЬ 2009 Выбар

# Кіраўнікі крадуць па-вялікаму...

На мінулым тыдні ўзбуджаны некалькі крымінальных спраў на бабруйскіх службовых асобаў, падазраваных у крадзяжы грашовых сродкаў у буйных памерах.

Як паведамляе газета "Вечерний Бобруйск", у пракуратуры Ленінскага раёна расследуецца справа ў дачыненні дырэктара аднаго з прадпрыемстваў Бабруйска Л., 1948 г.н., які разам з дырэктарам мінскай фірмы, па папярэдняй змове, у перыяд з ліпеня па верасень 2007 года шляхам падману і злоўжыванні даверам завалодалі акцыямі 22 удзельнікаў прадпрыемства на суму 401.204. 000 рублёў.

Генпракуратура распачала крымінальную справу ў дачыненні бабруйчаніна Д., 1970 г.н, што знаходзіцца ў міждзяржаўным вышуку, які, працуючы дырэктарам аднаго з прадпрыемстваў горада, у змове з іншымі службовымі асобамі ў лютым-сакавіку 2007 года здзейсніў крадзеж грашовых сродкаў у суме 90.600.000 рублёў.

УЎС Магілёўскага аблвыканкама вядзе следства па справе бухгалтара аднаго з бабруйскіх прадпрыемстваў Г., 1977 г.н. - яна, злоўжываюцы службовымі паўнамоцтвамі, выкрала 3.117.900 рублёў.

Працуючы на кіруючай пасадзе, 54-гадовы Е. шляхам неабгрунтаванага атрымання заработнай платы на імя сваёй жонкі, якая фактычна не працавала, здзейсніў крадзеж грашовых сродкаў у памеры 40.611.070 рублёў і ў яго дачыненні ва ЎЎС гарвыканкама ўзбуджана крымінальная справа.

# Дети ответят за отцов-самогонщиков

Устав от безрезультатных увещеваний самих продавцов спиртных суррогатов, в Бобруйске решили взяться за их детей. Как одно сообразуетсяч с другим – непонятно.

Недавно в актовом зале Бобруйского УВД состоялась профилактическая встреча для лиц, занимающихся незаконной торговлей спиртным. Поговорить по душам с гражданами, уже неоднократно в этом уличенными, пришли представители прокуратуры, инспекции по делам несовершеннолетних, суда и даже духовенства.

Для завязки разговора заместитель начальника городского УВД Сергей Малишевский подробно, с примерами и цифрами, осветил проблему пьянства и алкоголизма в Бобруйске. Видимо, чаша терпения лица, ответственного по службе за искоренение этой самой проблемы в городе, явно переполнилась. Начав с традиционных обещаний изымать имущество в счет уплаты штрафов, выселять из жилых помещений и сообщать в средства массовой информации, Малишевский перешел к угрозам изымать из этих семей несовершеннолетних детей, а также информировать ВУЗы, в которых учатся дети совершеннолетние. Мол, пусть знают, на какие нечестные деньги набираются ума некоторые студенты.

– Да это же прямо какой-то 37-й год! – возмущен Александр Федорович, многодетный отец. – Хороша наша милиция – с детьми воевать! – Подобное заявление можно сделать лишь от собственного бессилия, – считает социальный педагог Галина Леонидовна. – Такие действия могут даже подтолкнуть детей к самоубийству.

Здесь следует напомнить: еще в 2006 году перед намечавшимися в Бобруйске "Дожинками" тогдашний заместитель УВД Сергей Глушко обещал искоренить все "точки".

Тогда в городе и был создан специальный орган, определяющий стратегию и тактику борьбы со спаиванием народа – Координационный совет в составе представителей городских властей, суда, прокуратуры и милиции. В 2007 году к ним подключилось духовенство.

Положение на самом деле серьезное. Что борьба с алкоголизмом в Бобруйске провалена, признали на официальном уровне.

*Надежда Лисовская.*

# Гэта не правал, гэта крах!

Эканоміка Бабруйска павольна, але вельмі ўпэўнена падае ў прорву. Адзін за другім не выконваюцца асноўныя прагнозныя паказчыкі эканамічнага развіцця.

Бабруйскія ўлады планавалі ў 2008 годзе здаць у эксплуатацыю 115 тысяч квадратных метраў жылля.

Як паведаміў газеце "Вечерний Бобруйск" Начальнік аддзела будаўніцтва гарвыканкама Віктар Кандрат у 2008 годзе было здадзена ў эксплуатацыю амаль 79 тысяч квадратных метраў жылля.

Рэзкі спад аб'ёмаў будаўніцтва адзначаны ў другой палове 2008 года. За які было пабудавана амаль на 4 тысячы квадратных метраў жылля меньш.

Ужо ні хто не вядзе размову аб будаўніцтве комплеку "Алімпійскі", які планавалася цалкам пабудаваць да 2010 году.

*Максім Запрудны.*

# «Техноприбор» ожидают массовые увольнения

В первом квартале этого года на заводе собираются сократить 130 работников. Руководство завода уже направило соответствующую заявку исполнительной власти.

На Могилевщине это пока единственный случай, когда открыто заявляется о сокращении рабочих мест, передает БелаПАН.

О намерении сократить работников "Техноприбора" напомнил на заседании Могилевского горисполкома председатель Комитета государственного контроля Беларуси Зенон Ломать. "По каждой кандидатуре на увольнение должно быть твердое обоснование",— цитируют официальные источники предупреждение Ломатя.

На заводе не комментируют предполагаемое сокращение. В отделе кадров сообщили, что приказа об этом пока не получали.

"Техноприбор" входит в государственное объединение "Белвтормет". Представитель администрации объединения так объясняет необходимость сокращения: "У него 300 человек рабочих, а 700 человек — инженерно-технических работников. Специалисты должны работать, а балласт, если он есть, — или найдите им работу и загрузите их, и если не нашли работу, пусть идут с миром".

В проблемах могилевского завода представитель администрации обвиняет руководство, которое, по его словам, не в состоянии управлять производством. На заводском складе скопилось продукции на 10 миллиардов рублей, сообщил он.

"Запасы были бы значительно больше, если бы "Белвтормет" не забрал половину продукции. И продает сейчас по всей стране. А сами они продали на 150 миллионов. Мы туда вложили 1,8 миллиарда рублей в оборотные средства. Однако они этими средствами воспользоваться не могут. За счет бывших долгов у них снимают все, арестовывают", — отметил представитель администрации.

В мае 2007 года сообщалось о выявлении госконтролем приписки на "Техноприборе". По результатам тогдашней проверки, руководство искажало статистику, чтобы завод привлекательно смотрелся для банков и имел доступ к кредитам. Тогда сообщалось, что кредиторская задолженность предприятия составила 40 миллиардов рублей. Банкам же завод был должен около 20 миллиардов рублей.

"Техноприбор" выпускает деревообрабатывающие станки, светотехнику, оборудование для пищевой промышленности, а также товары народного потребления.

ВО ДАЮТ!

# Убрали 12 нулей

Центробанк Зимбабве провел очередную деноминацию, а также выпустил в обращение семь новых банкнот.

Как сообщает Lenta.ru со ссылкой на AFP, после деноминации 10 триллионов зимбабвийских долларов - купюра максимального номинала, имеющая хождение в стране - превратилась в десять долларов. Таким образом, с банкнот были убраны 12 нулей. По официальному курсу Центробанка Зимбабве один доллар США торговался на уровне четырех триллионов зимбабвийских долларов.

В свободное обращение были выпущены банкноты достоинством 1, 5, 10, 20, 50, 100 и 500 зимбабвийских долларов.

За последние полгода правительство и Центробанк Зимбабве проводят уже вторую деноминацию национальной валюты. В июле 2008 года с зимбабвийских банкнот были убраны 10 нулей. Правда, тогда в обращение не были выпущены новые купюры - центробанк вернул в обращение старые купюры достоинством 1, 5 и 10 зимбабвийских долларов.

16 января 2009 года правительство Зимбабве объявило о намерении ввести в обращение купюру в сто триллионов долларов. Теперь же, если купюра и будет напечатана, в обращение она будет введена позже. Из-за инфляции Центробанк Зимбабве регулярно добавляет дополнительные нули на выпускаемые купюры. В среднем инфляция в Зимбабве составляет около 230 миллионов процентов в год и является рекордной в мире.

# КАК В НЕКОТОРЫХ СТРАНАХ...

Путин косвенно прокомментировал 20% девальвацию курса белорусского рубля.

«Что касается ослабления национальной валюты (российского рубля), что касается резервов, мы ведь не поступили так, как в некоторых странах сделали. Мы не «грохнули» национальную валюту с сегодня на завтра».

«Мы это все делали плавно и аккуратно. Сознательно пошли на то, чтобы тратить золотовалютные резервы, дать возможность участникам экономической деятельности, включая и граждан, осознать происходящие процессы и принять соответствующие решения: кому куда уйти, в какую валюту, в рублях остаться, уйти в доллары, в евро, еще что-то сделать, уйти в недвижимость, и т.д. и т.п.. Как-то распорядиться своими запасами», - пояснил российский премьер.

БЯЛЫНІЧЫ

# За што прэмія?

Спецыяльная прэмія Бялыніцкага райвыканкама "Чалавек года – 2008" у намінацыі "Невытворчая дзейнасць" прысвоена дырэктару ДУА "Гімназія № 1 г. п. Бялынічы" Таццяне Балдушэўскай, якая ў мінулым годзе вызначылася тым, што актыўна адгаворвала бацькоў ад стварэння ў узначальваемай ёй установе адукацыі класаў з беларускай мовай навучання. Самае цікавае тое, што сама Таццяна Іванаўна з'яўляецца выкладчыцай беларускай мовы і літаратуры.

Нагадаю, што на працягу 2008 года грамадскія актывісты з Бялыніч Алег і Наталля Мяцеліцы неаднаразова звярталіся да кіраўніцтва Бялыніцкага РАНА і асабіста да дырэктара гімназіі № 1 Таццяны Балдушэўскай (у гімназіі навучаюцца дзеці Алега і Наталлі) з пісьмовымі просьбамі стварыць у гімназіі класы з беларускай мовай навучання. На ўсе звароты былі атрыманы адмоўныя адказы, у якіх кіраўніцтва РАНА і спадарыня Балдушэўская спасылаліся на эканамічную немэтазгоднасць стварэння класаў з беларускай мовай навучання, нягледзечы на тое, што дзяржава гарантуе правы выбару мовы навучання і выхавання дзяцей.

У чэрвені 2008 года быў праведзены сход бацькоў вучняў 5 і 9 класаў гімназіі № 1 г. п. Бялынічы. На сходзе з палымянай прамовай выступіла дырэктар гімназіі № 1, настаўніца беларускай мовы і літаратуры Таццяна Балдушэўская. У сваім выступе Таццяна Іванаўна выказалася супраць стварэння класаў з беларускай мовай навучання ў сувязі з эканамічнай немэтазгоднасцю. Таксама яна адзначыла, што вучням, скончыўшым 9 класаў, хутка патрэбна працягваць далейшае навучанне ў сярэднеспецыяльных і вышэйшых установах адукацыі, а на іх плечы кладзецца цяжар чарговай школьнай рэформы (дарэчы, распачатай нашымі вельмі разумнымі чыноўнікамі ад адукацыі), што наогул беларуская мова не з'яўляецца асабліва важнай, таму ствараць беларускамоўныя класы непатрэбна.

Ва ўсіх навучальных установах г. п. Бялынічы (а іх наведвае асноўная колькасць вучняў школ Бялыніцкага раёна) мовай навучання вызначана руская.

Нагадаю, што 2009 год указам кіраўніка краіны вызначаны як "Год роднай зямлі". Пытанне толькі ў тым,што калі з дзяцінства выхоўваць манкуртаў, ці застанецца на роднай беларускай зямлі хоць адзін беларус праз некалькі дзесяцігоддзяў...

*Сяргей Семяновіч*

---

ШКЛОЎ

# Актывіст БНФ застаўся за кратамі

Генэральная пракуратура не задаволіла просьбы памілаваць асуджанага шклоўскага актывіста партыі БНФ Аляксандра Фёдарава. Зь лістом аб памілаваньні да генэральнага пракурора Рыгора Васілевіча зьвярталася маці актывіста Анастасія Фёдарава. Паводле яе, генэральная пракуратура перанакіравала ліст у Магілёўскі абласны суд, які й вынес адмоўнае рашэньне.

У адказе Анастасіі Фёдаравай паведамілі, што яе просьбу задаволіць ня могуць, бо спадарыня Фёдарава не была ўдзельніцай судовага працэсу. А прасіць пра памілаваньне варта было цягам дзесяці дзён пасьля абвяшчэньня прысуду:

"А я ж гэтага й ня ведала, а то адразу ж напісала б. А што цяпер рабіць, я ня ведаю. Асудзілі яго несправядліва, бо людзі, якія скралі 85 мільёнаў, ужо на свабодзе, а ён за чатырнаццаць мусіць сядзець да канца. Ён ня краў гэтых грошай. Цяпер спадзяюся на ліст Лукашэнку, мо ён памілуе. Толькі нядаўна мне прыйшло спавяшчэньне, што ён дайшоў да адрасата", — зазначае Анастасія Фёдарава.

Лісты з просьбамі памілаваць сына спадарыня Фёдарава накіравала генпракурору Рыгору Васілевічу і прэзыдэнту Аляксандру Лукашэнку. У іх яна прывяла прыклады мякчэйшых прысудаў за цяжэйшыя злачынствы, зробленыя кіраўнікамі буйных дзяржаўных і камэрцыйных арганізацыяў. У зваротах яна згадвае выракі былому дырэктару "Белнафтахіму" Аляксандру Бароўскаму й былому дырэктару гандлёвага дома "Ждановічы" Яўгену Шыгалаву.

Кіраўніка шклоўскай суполкі партыі БНФ Аляксандра Фёдарава асудзілі на пяць гадоў пазбаўленьня волі з адбыцьцём пакараньня ў калёніі строгага рэжыму з канфіскацыяй маёмасьці.

Шклоўскі суд прызнаў Фёдарава вінаватым у злоўжываньні службовымі паўнамоцтвамі, парушэньні парадку выплаты заробкаў ды прысабечваньні дзяржаўнай маёмасьці на чатырнаццаць мільёнаў рублёў.

Аляксандар Фёдараў — актыўны ўдзельнік выбарчых кампаніяў. У 2001 годзе, падчас прэзыдэнцкіх выбараў, яго арыштоўвалі на загад раённага пракурора, але хутка вызвалілі.

*Радыё Свабода (Магілёў)*

# Духоўнае ачышчэнне

Аднойчы папаліся мне старыя нумары газеты "Народная воля" з надрукаванымі спісамі ўраджэнцаў Беларусі, рэпрэсаваных у Мурманскай вобласці. Гэтыя даныя з'явіліся дзякуючы намаганням кандыдата гістарычных навук Станіслава Дашчынскага, які ўратаваў з цемры забыцця імёны і прозвішчы нашых землякоў. Яму, а таксама рэдакцыі "Народнай волі", трэба падзякаваць за працу па духоўным ачышчэнні народнай памяці.

Што асабліва ўражвае, калі чытаеш звесткі пра загінуўшых людзей, дык гэта тое, што ў гэтых спісах — уся геаграфія Беларусі. Знайшлася згадка і пра жыхароў маёй Клімаўшчыны. Вось, напрыклад, Галкоўскі Аляксандр Емельянавіч – нарадзіўся ў 1909 годзе ў вёсцы Судзілы Клімавіцкага раёна. На момант арышту пражываў у г. Кіраўск Мурманскай вобласці. Што мог зрабіць небяспечнага для ўлады і краіны гэты беларус, які не меў кіраўнічых пасад, не ведаў дзяржаўных таямніц і сакрэтаў, бо працаваў звычайным слесарам на камбінаце? За што расстралялі маладога хлопца, якому не было яшчэ 30 гадоў? Магчыма, знойдзецца нейкі сучасны камуніст, які абгрунтуе смерць гэтай і іншых ахвяр таго крывавага часу...

Вельмі паказальна, што ўлада ні тады, ні зараз не жадала і не жадае пайсці на прызнанне жудаснасці сваёй антычалавечай палітыкі. Вось красамоўныя лічбы, якія сведчаць пра стаўленне да праўды ў савецкія часы. Пасля першых гадоў рэабілітацыі нявінна асуджаных (сярэдзіна 50-60 гг.) гэты працэс значна зменшыўся, і на працягу з 1971 па 1988 гады было рэабілітавана ўсяго каля трох тысяч чалавек. Пакуты мільёнаў простых людзей былі не заўважаны, і да таго ж іх працягвалі лічыць "ворагамі народа". Але ж гэта і быў народ – сяляне, рабочыя, служачыя. Нават афіцыйная статыстыка не здолела адмовіць той факт, што ў пік рэпрэсій 1937 года сярод рэпрэсаваных толькі кожны дзевяты быў членам кіруючай камуністычнай партыі, а ўсе астатнія "прадстаўлялі" заводы, калгасы, розныя ўстановы і арганізацыі.

Нагадаем яшчэ раз Аляксандра Галкоўскага. Калі я ўбачыў у газеце ягонае прозвішча, то вырашыў пагартаць кнігу "Памяць. Гісторыка-дакументальная хроніка Клімавіцкага раёна". У ёй надрукаваны раздзел "Вярнутыя імёны", прысвечаны памяці рэпрэсаваных клімавіцкіх жыхароў. Тут таксама змешчаны спісы загінуўшых і пацярпеўшых ад палітычных рэпрэсій, якія займаюць у кнізе 32 старонкі. Ёсць сярод іх і Галкоўскія. Галкоўскі А.Я. – калгаснік, Галкоўскі Д.В. – земляроб, Галкоўскі К.В. – настаўнік, Галкоўскі П.М. – настаўнік, Галкоўскі С.Л. – калгаснік. Як бачыце, яны не вельмі адрозніваюцца сваім становішчам і пасадамі ад слесара Галкоўскага. З гэтых пяці адзін быў расстраляны, двое атрымалі па 10 год зняволення, астатнія прайшлі праз арышт і высылку з Беларусі. Такі лёс людзей, ад якіх сёння засталіся толькі 32 старонкі тэксту з імёнамі і прозвішчамі шматлікіх ахвяр жудаснага сацыяльнага эксперыменту XX стагоддзя.

Сяржук АРЖАНЦАЎ



# Адзіноцтва вясковых пенсіянераў

Зараз на тэрыторыі Магілеўскай вобласці пражывае каля 290 тысяч пенсіянераў. Гэта вялікая лічба, бо пенсіянерам з'яўляецца кожны чацвёрты жыхар Магілеўшчыны. Насельніцтва вобласці, як і краіны таксама, імкліва старэе. Нездарма ўсё часцей ідзе гаворка пра неабходнасць перагляду пенсійнага ўзросту. Праблема ўзмацняецца тым, што на вёсцы становішча яшчэ больш катастрафічнае, тут жывуць пераважна старыя і адзінокія людзі.

Возьмем для прыкладу Мілаславіцкі сельсавет Клімавіцкага раёну. У межах сельсавету знаходзіцца 15 населеных пунктаў. У гэтых вёсках пражывае прыкладна 1500 чалавек, у тым ліку каля 500 пенсіянераў. Атрымліваецца, што гэта кожны трэці жыхар Міласлаўшчыны. Сярод іх 270 адзінока пражываючых і 62 проста адзінокіх людзей, у якіх не засталося ніякіх сваякоў. Нельга не адзначыць і тое, што дзесяць вёсак лічацца маланаселенымі, бо агульная колькасць іхніх жыхароў — 112 чалавек. У некаторых вёсачках жыве па тры-пяць чалавек. У Данілаўцы засталася адна жанчына, апошняя з насельнікаў гэтай мясцовасці. Цяжка прагназаваць будучыню, але хутчэй за ўсё становішча ў бліжэйшыя гады наўрад ці зменіцца да лепшага.

Сяржук АРЖАНЦАЎ,
Фота з архіва

# Затрыманне Хведарука, Шылы і Вячоркі – парушэнне нормаў закону

Намеснік кіраўніка Руху "За Свабоду" Юрась Губарэвіч каментуе раптоўную адпраўку ў войска моладзевых актывістаў.

Прызыў у войска павінен ажыццяўляцца ў строгай адпаведнасці з прапісанымі ў Законе працэдурамі. Усе пытанні паміж прызыўнікам і ваенкаматам павінны вырашацца з выкарыстаннем цывілізаваных захадаў. Калі ўлада лічыць, што прызыўнік пазбягае прызыву, а ён з гэтым не згодны, спрэчнае пытанне можна вырашыць праз суд,   кажа Юрась Губарэвіч.

Намеснік кіраўніка Руху "За Свабоду" перакананы, што прымяненне гвалту супраць ваеннаабавязаных недапушчальна. Адпраўка ў войска пад прымусам, у кайданках   гэта парушэнне нормаў закону.

Як вядома, у апошнія дні, не гледзячы на прычыны, якія даюць права на адтэрміноўку, з мэтай адпраўкі ў войска гвалтоўна затрыманыя моладзевыя актывісты Зміцер Хведарук, Франак Вячорка і Іван Шыла.

# Ці захочуць чыноўнікі раіцца з апазіцыяй?

Сябры Руху "За Свабоду" ініцыююць стварэнне грамадска-кансультацыйных Радаў пры мясцовых выканкамах па ўсёй Беларусі.

29 студзеня член Рады ПАГА Рух "За Свабоду" Алесь Зарэмбюк накіраваў у Мастоўскі райвыканкам зварот з прапановай стварыць пры Мастоўскім райвыканкаме грамадска-кансультатыўную Раду з удзелам прадстаўнікоў мясцовай улады, палітычных партый, грамадскіх арганізацый, прафсаюзаў.

- Мэтай Рады з'яўляецца абмеркаванне актуальных пытанняў развіцця дзяржавы, рэгёна і грамадства, выпрацоўка прапановаў па больш актыўным далучэнні да агульнасусветных працэсаў, удасканаленне напрамкаў сацыяльна эканамічнага і палітычнага развіцця Мастоўскага раёна, - адзначае Алесь Зарэмбюк.

Актывісты Руху "За Свабоду" накіравалі звароты з прапановай стварыць грамадска-каардынацыйныя Рады ў райвыканкамы Мінска, Барысава і шэрагу іншых беларускіх гарадоў.

# Актывіста Руху палічылі вінаватым у акцыі, якой не было

Мінскі абласны суд пакіну без зменаў рашэнне Клецкага суда пра пакаранне Сяргея Панамарова буйным штрафам.

Па словах актывіста Руху "За Свабоду", супрацоўнікі Клецкай пракуратуры ў гутарцы з ім выказалі шчырае здзіўленне рашэннем абласнога суда і параілі звяртацца ў Вярхоўны суд. Юрысты лічаць, што праўда на баку Сяргея Панамарова.

Актывіст збіраецца арганізаваць акцыю па збору сродкаў для клецкай суддзі Алены Гасцеевай, якой на яго думку, мабыць, не хапае грошай. Менавіта яна пакарала актывіста штрафам у 1 мільён 50 тысяч рублёў за нібыта арганінізацыю несанкцыянаванага масавага мерапрыемства. Сяргей Панамароў таксама намераны дабівацца праўды ў Вярхоўным судзе.

Як вядома, актывістам рыхтавалася сустрэча жыхароў Клецку са старшынём Таварыства аховы помнікаў Антонам Астаповічам, якую, да таго ж, не дазволілі правесці міліцыянты Клецкага РАУС.

№44 СТУДЗЕНЬ 2009 Выбар

Магілеўская абласная газэта. Выдавец: Магілеўская абласная кааліцыя дэмакратычных сілаў.

Галоўны радактар: Эдуард Брокараў, тэл. 545 89 83, электронная адрэса: brok61@yandex.ru
Наклад: 299 асобнікаў, фармат А4, 8 палос.
Падчас выданьня ужываюцца: беларуская (тарашкевіца), беларуская (наркомаўка) ды расейская мовы. Матар'ялы друкуюцца на мове аўтара. Палітычная й моўная цэнзура адсутнічае. Вітаюцца мастацкія творы, а таксама – журналісцкія матар'ялы на беларускай мове. Погляды аўтараў могуць не супадаць з пазыцыяй радакцыі. Радакцыя самастойна прымае рашэньні аб мэтазгоднасьці ўступленьня ў перапіску, а таксама аб разьмяшчэньні бясплатнай сацыяльнай раклямы
У нумары выкарыстаны матар'ялы сайтаў: svaboda.org; racyja.com; milinkewits.org; pbnf.org; belsat.eu, uzgorak.na.by, atomby.net, charter97.org; horki.info.